■ Факт

СКЛАДАЕМ СВОЙ АТЛАС НОВЫХ ПРАФЕСІЙ

«Каталог найноўшых спецыяльнасцяў, якія плануецца ўводзіць у беларускіх ВНУ пасля 2021 года, будзе прэзентаваны грамадскасці ў пачатку вясны», — паабяцаў падчас адкрыцця Рэспубліканскага фестывалю маладзёжнай навукі міністр адукацыі Міхаіл ЖУРАЎКОЎ.

Як патлумачыў кіраўнік ведамства, размова ідзе пра падрыхтоўку спецыялістаў, якія будуць распрацоўваць беспілотныя канструкцыі, займацца робататэхнікай і іншых. «Мы збіраемся апублікаваць каталог загадзя для таго, каб даць вышэйшым навучальным установам час падрыхтавацца да ўкаранення неабходных для эканомікі нашай краіны спецыяльнасцяў», — распавёў Міхаіл Жураўкоў.

Ён падкрэсліў, што моладзь заўсёды прытрымліваецца самых шырокіх поглядаў, і гэта дазваляе ёй здзяйсняць адкрыцці. У нашай краіне больш за 90 тысяч студэнтаў прымаюць удзел у навуковых даследаваннях. У многіх сферах менавіта маладыя навукоўцы займаюць лідзіруючыя пазіцыі. У якасці прыкладу Міхаіл Жураўкоў прывёў сумесныя навукаёмістыя праекты БДУ, БДУІР, БНТУ з еўрапейскімі ВНУ, якія тычацца развіцця ІТ-тэхналогій, хіміі, фізікі і іншых дысцыплін. Адзін з іх — праект «ФабЛаб». Размова ідзе пра лабараторыю, якая дае магчымасць студэнтам вырабляць эскізныя і доследныя ўзоры інавацыйнай прадукцыі на сучасным абсталяванні: 3D-прынтарах і сканерах, універсальных станках з лічбавым праграмным кіраваннем.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

У Ліцэі БДУ быў дадзены старт рэспубліканскаму праекту «Запрашэнне ў свет навукі» — ён будзе рэалізоўвацца цягам года, фестывальныя мерапрыемствы пройдуць як у мінскіх ВНУ, так і ва ўсіх рэгіянальных установах вышэйшай адукацыі. У Ліцэі была размешчана экспазіцыя навукова-тэхнічных распрацовак маладых вучоных Белдзяржуніверсітэта і сталічных ВНУ. Напрыклад, тут можна было пабачыць спадарожнікавыя сістэмы для маніторынгу перамяшчэння транспарту, шматфункцыянальны вымяральны комплекс «Alma-Meter», рэгістратар параметраў руху ліфтавага пад'ёмнага абсталявання «Палтус», камп'ютарную вучэбную лабараторную ўстаноўку для правядзення лабараторных практыкумаў па радыёэлектроніцы і іншыя.

Таксама быў прадстаўлены ўвесь дыяпазон выкарыстання папулярных у харчовай прамысловасці ядомых плёнак. У іх стварэнні прымала ўдзел малодшы навуковы супрацоўнік НДІ фізіка-хімічных праблем БДУ Наталля Мелехавец. Хімікі БДУ прапануюць уводзіць у склад упаковачных плёнак розныя інгрэдыенты, якія надаюць ім асаблівы смак і дапаўняюць карысныя ўласцівасці спакаванага прадукта.

Надзея НІКАЛАЕВА.
nikalaeva@zviazda.by

■

ЧАС АГУЛЬНАЙ АДКАЗНАСЦІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў у складзе дэлегацый Нацыянальнага сходу ініцыятыўна працуюць на міжнародных парламенцкіх пляцоўках, развіваюць міжпарламенцкае і міжнароднае супрацоўніцтва на двухбаковым і шматбаковым узроўнях, удзельнічаюць у розных міжнародных мерапрыемствах, што праводзяцца пад эгідай ААН, буйнейшай міжнароднай парламенцкай арганізацыі — Міжпарламенцкага саюза, еўрапейскіх, еўразійскіх і азіяцкіх парламенцкіх структур.

Толькі на фундаменце духоўнасці, культуры і адукацыі мы зможам памнажаць канкурэнтаздольнасць краіны ў такім складаным, мультыкультуралістычным свеце. Вельмі важна абапірацца на культурныя здабыткі народа, гістарычны вопыт і нашы нацыянальныя традыцыі.

— Пасля ўдзелу ў Сусветнай канферэнцыі спікераў парламентаў у Нью-Ёрку і сустрэчы з Генеральным сакратаром ААН Пан Гі Мунам якое ваша бачанне іміджу Беларусі ў міжнароднай супольнасці?

— Гэтая канферэнцыя папярэднічала саміту кіраўнікоў дзяржаў, які прайшоў у верасні ў рамках юбілейнай 70-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН, на якой двойчы выступіў Прэзідэнт нашай дзяржавы Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка, што гаворыць само за сябе. Яго выступленні па тэматыцы прыярытэтаў развіцця чалавецтва на бліжэйшыя 15 гадоў і прынцыпаў будучага існавання дзяржаў і народаў атрымалі вельмі станоўчы міжнародны рэзананс. Несумненна, што Рэспубліка Беларусь усё больш успрымаецца ў нашым трывожным свеце, напоўненым зацяжнымі, у тым ліку ваеннымі, канфліктамі і процістаяннем, як прыцягальны астравок міру і бяспекі. Я меў магчымасць пераканацца ў гэтым на нью-ёркскай Сусветнай парламенцкай канферэнцыі, дзе выступіў па пытанні «Выкарыстанне дэмакратыі ў інтарэсах міру і ўстойлівага развіцця, стварэнне свету, якога людзі хочуць», сустрэўся ў штаб-кватэры ААН з Генеральным сакратаром ААН Пан Гі Мунам і праведзеную ім шэраг двухбаковых сустрэч са сваімі калегамі з замежных краін. У размове Пан Гі Мун высока ацаніў намаганні Беларусі па зняцці напружанасці, якая існуе ва Украіне, і тое, што робіць наша дзяржава ў барацьбе з сучаснымі выклікамі і пагрозамі, выказаў задавальненне ўдзелам Беларусі ў дзейнасці Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Я адзначыў гатоўнасць беларускага парламента паўнацэнна садзейнічаць ажыццяўленню парадку дня ўстойлівага развіцця, як праз заканадаўчую працу, так і адпаведную парламенцкую дзейнасць на рэгіянальным і міжнародным узроўнях.

— Калі б дэмакратыя сапраўды і паўсюдна выкарыстоўвалася як інструмент міру і ўстойлівага развіцця, было б цудоўна. Аднак падзеі ў сённяшнім свеце не вельмі абнадзейваюць, што так можа адбыцца ў аглядная перспектыве. Якая ваша думка на гэты конт?

— Праблема мнагаслойная. Кожная краіна развіваецца з улікам сваіх асаблівасцяў — нацыянальных, грамадска-палітычных, гістарычных, рэлігійных, культурных, з улікам сваіх традыцый, прававой і палітычнай культуры грамадзян, іх сацыяльнай актыўнасці. Значыць, дэмакратыя ў гэтым разнастайным свеце можа развівацца толькі разнастайна. Трэба быць рэалістамі. Калі ж разнастайнасць спрабуюць запіхнуць у адну нібыта ўніверсальную схему, а рэальныя патрэбы грамадства ігнаруюць, то атрымліваецца тое, што атрымалася, напрыклад, некалькі гадоў таму ў краінах паўночнай дугі Афрыкі, а цяпер на Блізкім Усходзе. Дыскусія, што адбылася пад дахам ААН на Сусветнай канферэнцыі спікераў парламентаў, мне падаецца важнай і карыснай, бо на ёй абазначаны грані кансалідацыі парламентарыяў у павышэнні рэзультатыўнасці дэмакратычных працэсаў у інтарэсах міру і ўстойлівага развіцця.

— Як вы ацэньваеце нядаўнія беспарадкі ў Германіі і некаторых іншых краінах Еўропы, учыненыя мігрантамі?

— Ацэнка іх можа быць толькі адна — негатыўная. Гэта ўрок не толькі для Еўрасаюза — наколькі сур'ёзную грамадскую небяспеку тояць у сабе экстрэмісцкія і проста ганебныя дзеянні, калі іх своечасова не папярэджваюць і рашуча не спыняюць, даючы тым самым злачынству патачку. Незалежна ад таго, кім такія дзеянні ўчынены — мігрантамі або сваімі грамадзянамі, паблажлівасць да іх недапушчальная. Калі людзі бягуць у іншую краіну па нармальнае жыццё, то ўлады, якія іх прымаюць, павінны патлумачыць ім важнейшыя складнікі нармальнага жыцця — законнасць і парадак, нормы грамадскіх паводзін, якія ўсім трэба выконваць. Увогуле ж міграцыйная палітыка ў глабальным парадку дня адна з самых актуальных і застанецца такой яшчэ працяглы час, мяркуючы па існуючых у свеце небяспечных палітычных, эканамічных, сацыяльных, этнічных, экалагічных і іншых праблемах. Таму сёння асабліва важна, каб у іх прадметным вырашэнні сусветная супольнасць выходзіла ў фармаце ААН у плоскасць цеснага ўзаемадзеяння і партнёрства.

— Прыклад добрай волі Рэспублікі Беларусь мае для гэтага значэнне?

— Мае значэнне прыклад кожнай краіны — і вялікай, і сярэдняй, і малой, таму што час патрабуе ад нас агульнай адказнасці. Беларусь, дзякуючы нашаму Прэзідэнту, у даволі няпростых умовах працяглага знешняга прэсінгу за сваю самастойную дзяржаўную пазіцыю, пазбегла тых катаклізмаў, якія трасуць свет, у тым ліку ў сваёй міграцыйнай палітыцы, і застаецца па-ранейшаму настроенай на логіку мірнага стварэння і міжнароднай кансалідацыі ў дасягненні агульных мэт развіцця. Гэта на сусветнай арэне заўважылі.

— На фоне канструктыўнага ўзаемадзеяння Нацыянальнага сходу Беларусі з Парламенцкай асамблеяй АБСЕ дысанансам выглядаюць стасункі з ПАСЕ. Калі ў пазіцыі ПАСЕ ўсё-такі возьме верх здаровы сэнс, як будуць развівацца двухбаковыя кантакты?

— Мы ніколі не былі супраць нармальных адносін з ПАСЕ, яны затарможаны не намі. Але штучная паўза ў дыялогу не выбіла нас з рэчышча інтэнсіўнай міжнароднай і міжпарламенцкай работы, пра што я ўжо сказаў. Беларуская парламенцкая дэлегацыя актыўна ўдзельнічае ў сесіях Парламенцкай асамблеі АБСЕ, распрацавала нямала рэзалюцый. Напрыклад, якія датычацца зялёнай эканомікі, барацьбы з гандлем людзьмі. Напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў у Палаце прадстаўнікоў адбылася сустрэча з намеснікам Старшыні АБСЕ, кіраўніком дэлегацыі парламента Швецыі ў ПА АБСЕ Кентам Харстэдам. Лічу, што пры пазітыўным падыходзе ПАСЕ да аднаўлення пастаянных кантактаў з Нацыянальным сходам Беларусі на раўнапраўнай, узаемапаважлівай платформе мог бы дынамічна развівацца канструктыўны дыялог, карысны як для Савета Еўропы, так і для Беларусі. Гэта пацвярджаецца тым, што кантакты нашай краіны і краін Еўрасаюза апошнім часам актывізаваліся.

Задача парламенцкай дыпламатыі ў тым, каб граматна, з карысцю для краіны — гандлёва-эканамічнай і палітычнай — рэагаваць на сучасныя выклікі, унутраныя і знешнія праблемы, з якімі сёння сутыкаецца Беларусь.

— Што галоўнае, на ваш погляд, паказалі вынікі прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі?

— Яны засведчылі лідарскую кансалідуючую ролю Аляксандра Лукашэнкі ў дзяржаве і грамадстве, давер да яго палітыкі, а таксама шырокую грамадскую згоду ў стаўленні да нашых нацыянальных інтарэсаў і прыярытэтаў краіны на міжнароднай арэне.

— 2016 год аб'яўлены Прэзідэнтам Годам культуры. Як вы мяркуеце, для чаго нам патрэбна ахоўваць нашы нацыянальныя, дзяржаўныя карані?

— Каб умацоўваць гонар за сваю родную Беларусь, асабліва ў маладых пакаленняў, якія будуць развіваць і ўмацоўваць нашу дзяржаву. Толькі на фундаменце духоўнасці, культуры і адукацыі мы зможам памнажаць канкурэнтаздольнасць краіны ў такім складаным, мультыкультуралістычным свеце. Вельмі важна абапірацца на культурныя здабыткі народа, гістарычны вопыт і нашы нацыянальныя традыцыі, у тым ліку ў адукацыі і навуцы. Гэта вялікая стваральная сіла па яе патрыятычным уздзеянні на розумы і сэрцы людзей, на іх светапогляд, якая ў многім вызначае будучыню нашай суверэннай, незалежнай дзяржавы, яе месца ў свеце.

— Сёлета адбудуцца парламенцкія выбары. Палата прадстаўнікоў пятага склікання завяршае сваю кадэнцыю. Якую задачу вы лічыце прыярытэтнай на фінішным этапе працы цяперашняга дэпутацкага корпуса?

— У нас ёсць задача, якая не губляе сваёй актуальнасці, — стварацьмаксімальна спрыяльныя заканадаўчыя ўмовы для забеспячэння дынамічнага сацыяльна-эканамічнага развіцця і надзейнай бяспекі краіны. Дзеля гэтага мы і працуем.

Аляксандр ФІЛІМОНАЎ.

■ Даслоўна

НЕЗАКОННАЯ МІГРАЦЫЯ — ТРАНСНАЦЫЯНАЛЬНАЯ З'ЯВА

Праблема нелегальных мігрантаў, якая ахапіла Еўропу, Беларусь амаль не закранула. Аднак, як лічыць Жан Іў Бушардзі, прадстаўнік кіраўніцтва Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў у Беларусі, усё можа змяніцца вокамгненна, і трэба быць гатовымі да масавага прытоку мігрантаў.

Як паведамілі «Звяздзе» ў Дэпартаменце па грамадзянстве і міграцыі Міністэрства ўнутраных спраў, за 2015 год праваахоўнікам удалося затрымаць 21 групу незаконных мігрантаў, колькасцю 84 чалавекі. За 2014 год — 11 груп (44 мігранты). У параўнанні з адпаведным тэрмінам пазамінулага года гэты паказчык павялічыўся ўдвая.

— Для Беларусі нелегальныя мігранты — гэта таксама праблема, — кажа **Дзмітрый САВЕЛЬЕЎ, намеснік кіраўніка аддзела Галоўнага ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй МУС.** — Іх затрымліваюць пастаянна. Робяць гэта і інспектары ДАІ на дарозе, і супрацоўнікі міграцыйнай службы падчас рэйдаў, і нават супрацоўнікі АМАПа, якія ў падазронай асобы могуць проста праверыць дакументы. Справа ў тым, што наша краіна займае транзітнае становішча паміж Расіяй і Еўропай. Замежнікі без перашкод атрымліваюць расійскую візу і шукаюць лепшага жыцця ў Еўрасаюзе. Пераважна гэта выхадцы з Блізкага Усходу і краін Паўднёва-Усходняй Азіі: Пакістана, В'етнама, Бангладэша, Індыі, Сірыі. А ёсць яшчэ тыя іншаземцы, што прыязджаюць да нас вучыцца і нейкім спосабам пасля спрабуюць легалізавацца ў Беларусі.

— Якім шляхам большасць з іх трапляе ў нашу краіну?

— Калі гаворка ідзе пра транзітную міграцыю, яны на аўтамабілях, мікрааўтобусах перасякаюць мяжу Беларусі і Расіі ў суправаджэнні некалькіх машын. Праязджаюць усю тэрыторыю Беларусі, і на мяжы з Еўрасаюзам іх сустракаюць праваднікі — мясцовыя жыхары, якія ў той ці іншай ступені звязаны з незаконным перамяшчэннем праз мяжу кантрабанды.

— Хто найчасцей дапамагае ім перайсці мяжу?

— Апошнім часам гэта робяць каўказцы, за што атрымліваюць буйныя сумы грошай. Паводле розных паказанняў затрыманых мігрантаў, яны даходзяць да 10 тысяч долараў з чалавека. І едуць нелегалы не толькі ў Польшчу, але і ў Латвію і Літву. Дзе з'яўляецца магчымасць перайсці мяжу, туды яны і лезуць. А на тым баку іх ужо чакаюць, сустракаюць. Сёння незаконная міграцыя стала транснацыянальнай з'явай. Колькі гадоў таму мы затрымалі групу афганцаў, якія прыехалі да нас з Расіі. Як высветлілася, іх гісторыя з праваднікамі пачыналася яшчэ ў Афганістане, пасля працягнулася ў Таджыкістане, потым іх пераправілі ва Узбекістан і пасля таго, як перасяклі яшчэ некалькі краін, яны апынуліся ў Беларусі.

— Выпадкі, калі азіяты выбіралі менавіта нашу краіну месцам сталага жыхарства, рэдкія?

— Чаму ж? Ёсць і такія. Каб узаконіць сваё пражыванне ў Беларусі, людзі за матэрыяльную ўзнагароду заключаюць фіктыўныя шлюбы. Гэта дае ім магчымасць атрымаць у нас дазвол на пражыванне. І калі замежнік стварае сям'ю, яму даюць від на жыхарства. Наша падраздзяленне сумесна з Дэпартаментам па грамадзянстве і міграцыі імкнецца падобныя шлюбы выяўляць. Крымінальнай адказнасці за іх у нас няма, але, калі ёсць арганізатар фіктыўных шлюбаў, можна гаварыць аб прыкметах незаконнай міграцыі. І падобныя выпадкі былі. Адзін в'етнамец у Беларусь прыехаў даўно, абзавёўся сям'ёй, і многія суайчыннікі звярталіся да яго, каб пераехаць жыць у нашу краіну. Ён за грошы шукаў ім жонак, а жанчынам — мужоў. Іх працаўладкоўвалі, пасля жанілі, і яны заставаліся ў нашай краіне.

— Мне падаецца, пазалеташні чэмпіянат свету па хакей падкінуў вам дадатковых праблем...

— Так, напрыклад, падчас спаборніцтваў пад відам навядвання хакейных паядынкаў паявіўся прадпрымальны нігерыец і прывёз з сабой... 23 суайчыннікі *(падчас спаборніцтваў замежныя ўладальнікі квіткоў маглі патрапіць на тэрыторыю нашай краіны без віз.* — **Аўт.**). Яны, безумоўна, паказвалі білеты, казалі, што з'яўляюцца ўдзельнікамі бізнес-форуму, што таксама адбываўся ў Мінску. Час ад часу нават наведвалі хакей, але, калі тэрмін дзеяння іх рэгістрацыі скончыўся, яны павінны былі пакінуць Беларусь. Частка з іх тут засталася. Былі складзены адміністрацыйныя пратаколы, іх змясцілі ў цэнтр ізаляцыі правапарушальнікаў, бо не было нават сродкаў на пражыванне і харчаванне. Як высветлілася пазней, яны спрабавалі праз Беларусь трапіць у Еўропу. Аператыўныя мерапрыемствы пацвердзілі, што гэта быў канал міграцыі, аднак у Следчым камітэце палічылі, што злачынных дзеянняў не было. Іх дэпартавалі з краіны і забаранілі ўезд на 5 гадоў.

— Аляксей Бягун, начальнік Дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі МУС, нядаўна прызнаўся, што Сірыя, якая знаходзіцца ў эпіцэнтры баявых дзеянняў на Блізкім Усходзе, займае другое месца па колькасці хадайніцтваў на атрыманне статусу бежанца ў Беларусі.

— Нелегалы з Сірыі ехалі і едуць у Беларусь. Што цікава, нават сярод легальных мігрантаў шмат тых, хто спрабуе сваім суайчыннікам за вялікія грошы дапамагчы незаконна перабрацца ў нашу краіну ці ў Еўропу. Некаторыя іх падманваюць. Грамадзянін Сірыі доўгі час жыў у Брэсце. Мае жонку, дзяцей. Займаўся гандлем — прадаваў тканіну на некалькіх рынках. Праўда, пасля ён вырашыў, што гандляваць тканінай, па-першае, нявыгадна, а, па-другое, трэба ж аплачваць падаткі, арэнду... А навошта гэта рабіць, калі можна сваім суайчыннікам дапамагаць пераязджаць у краіны Еўрасаюза? Па сапраўдных візах яны прыбывалі ў Расію, пасля ехалі ў Брэст. Іх, безумоўна, заўважалі. І мытнікі, і супрацоўнікі праваахоўных органаў часта запрашалі яго як перакладчыка. Ён ведаў многія нюансы, людзі па яго парадзе ішлі ў міграцыйныя органы, заяўлялі, што яны нелегалы і жадаюць атрымаць беларускую выязную візу, каб пасля законна трапіць у Польшчу. Ім яе рабілі, аб'яўлялі аб дэпартацыі, выклікалі гэтага перакладчыка. А той іх саджаў на цягнік да Цярэспаля, і пры сустрэчы з польскімі памежнікамі яны заяўлялі аб тым, што бежанцы. Большасць з іх прымалі, а пасля гэтаму сірыйскаму брастаўчаніну з-за мяжы прыходзілі значныя сумы грошай.

— І як вы яго затрымалі?

— А ён не дамовіўся па цане з апошняй групай, якая прыехала ў Беларусь. Яго падвяла сквапнасць. Ім здалося, што ён іх падманвае, і яны з ім пасварыліся. Камеры відэаназірання гэта зафіксавалі. Іх затрымалі, супраць яго далі паказанні. Агулам у Еўрасаюз ён перавёз 7-8 груп нелегальных мігрантаў.

— Якая верагоднасць таго, што сярод сірыйскіх нелегалаў могуць быць удзельнікі былых бандфарміраванняў?

— Вядомыя байцы «Ісламскай дзяржавы», якія ваююць на тэрыторыі Сірыі, знаходзяцца на кантролі ў нашым КДБ і ў памежнікаў. Усе ведамствы паміж сабой узаемадзейнічаюць. І я не скажу, што ў Беларусі выяўлена шмат падобных фактаў. Усяго затрымалі некалькі чалавек, якія знаходзіліся пераважна ў вышуку ў Расіі. Іх экстрадзіравалі.

Тарас ШЧЫРЫ. *taras@zviazda.by*

■

«УХАПІЛІСЯ» ЗА РЫНАК

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Самазвалы БелАЗ-75581 спецыяльна спраектаваны для працы ў кар'ерах па адкрытай здабычы карысных выкапняў і прыстасаваныя да розных кліматычных умоў. Аўтамабілі аснашчаны сучасным дызельным рухавіком і новай электрычнай трансмісіяй змена-пераменнага току, якая не патрабуе пераключэння перадач. Акрамя таго, у іх адсутнічаюць вузлы, якія падвяргаюцца моцнаму механічнаму зносу. Гэтыя фактары забяспечваюць меншыя эксплуатацыйныя выдаткі і вялікую прадукцыйнасць, дазваляюць знізіць расход паліва.

У новым годзе — новыя шыны

Прадпрыемства «Белшына» мае намер сёлета наладзіць вытворчасць шын для самазвалаў вялікай і асабліва вялікай грузападымальнасці. Гэты буйны інвестыцыйны праект па тэхнераўзбраенні асноўнай вытворчасці рэалізуецца на заводзе звышбуйнагабарытных шын. Яго асноўнай мэтай з'яўляецца стварэнне радыяльных суцэльнаметалакордных шын на 57 і 63 цалі. У год іх будуць выпускаць больш за 8 тысяч. Рэалізацыя праекта дасць магчымасць павялічыць асартымент і аб'ёмы вытворчасці гэтых шын для камплектацыі самазвалаў БелАЗ, а таксама замежнай кар'ернай тэхнікі. Падобную прадукцыю вырабляюць цяпер толькі дзве кампаніі — Bridgestone і Michelin.

Да канца 2016 года на прадпрыемстве завершацца будаўніча-мантажныя работы і ўвядуць у строй новае абсталяванне. У 2017 годзе пройдзе засваенне магутнасцяў, выпрабаванне новых шын. Па меркаванні спецыялістаў, гэта будзе самая рэнтабельная прадукцыя, якую сёння выпускае прадпрыемства.

Новыя краны і ўборачная машына

У Магілёве ідзе рэалізацыя першага этапу праекта МАЗ і кітайскай кампаніі Zoomlion па стварэнні сумеснай вытворчасці па вырабе шырокай гамы спецыяльнай тэхнікі, у тым ліку дарожнай, будаўнічай і камунальнай. Zoomlion — транснацыянальная кампанія, найбуйнейшы вытворца абсталявання для сельскай гаспадаркі, будаўніцтва, энергетыкі, транспартных праектаў у Кітаі ўваходзіць у лік сусветных лідараў у двух сегментах: бетоннае абсталяванне і пад'ёмная тэхніка. Ужо зараз сумесныя намаганнямі кампаніі вырабілі аўтамабільныя краны грузападымальнасцю 40 і 60 тон і ўборачную машыну. У якасці базавага шасі на іх выкарыстоўваецца шасі МАЗ. Рэалізацыя сумеснага інвестыцыйнага праекта ажыццяўляецца па стратэгічным напрамку супрацоўніцтва Беларусі і Кітая. Кааперацыя дазволіць пашырыць наменклатуру выпускаемай прадукцыі, забяспечыць атрыманне ноу-хау ў новых галінах, дапаможа вырашыць пытанні імпартазамяшчэння на рынку Беларусі.

Ілья КРЫЖЭВІЧ.
Kryzhevich@zviazda.by

МЯЖУ «ЎЗБРОЯЦЬ» ЖАНОЧЫМІ ЎСМЕШКАМІ

Інстытут памежнай службы ўпершыню аб'явіў аб прыёме дзяўчат.

Падчас наступнай прыёмнай кампаніі на конкурснай аснове ў інстытут будуць прымацца не толькі юнакі, але і дзяўчаты ва ўзросце ад 17 да 21 года, якія з'яўляюцца грамадзянамі Беларусі, з агульнай сярэдняй, прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. Усяго план набору ў Інстытут памежнай службы на 2016/2017 навучальны год складзе 100 чалавек: для дзяўчат выдзяляюцца 20 месцаў. Іх будуць рыхтаваць па спецыяльнасці «Кіраванне падраздзяленнямі памежнага кантролю».

У навучальнай установе звяртаюць увагу, што заявы для паступлення неабходна падаць да 1 красавіка 2016 года ў ваенкаматы па месцы жыхарства. Дадатковую інфармацыю можна атрымаць па тэлефоне 8017-281-70-96 або на сайце інстытута.

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

Бобруйское управление филиала «Центр «Белтехинвентаризация» оказывает услуги по:

- оценке имущества (недвижимость, транспорт, оборудование)
- организации и проведению аукционных торгов
- инвентаризации и оценке зеленых насаждений

ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ: 04 февраля 2016 в 11.00 состоятся ПОВТОРНЫЕ открытые аукционные торги (торги) по продаже имущества, обращенного в доход государства, в составе:

Лот № 1 – одним лотом (предмет торгов)	Лот № 2 (предмет торгов)
- капитальное строение 710/С-9114 (здание магазина смешанной торговли и офиса) общ. пл. по данным выписки из ЕГРНИ – 847,6 кв.м, по данным ведомости технических характеристик общ. пл. – 867,4 кв.м; - роллеты размером 1000х1870 мм в кол-ве 6 штук; - роллеты размером 2340х2800 мм в кол-ве 2 штук, расположенные по адресу: г. Бобруйск, ул. К.Маркса, д. 36	Изолированное помещение с инвентарным номером 710/D-15120 (квартира № 313) общ. пл.111,7 кв.м, расположенное по адресу: г. Бобруйск, ул. Максима Горького, д. 41

Организатор торгов	Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», УНП 102353509, ОКПО 55484006, 220034, г. Минск, ул. Чапаева, д. 4, к. 222, р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минска, МФО 153001369
Место проведения торгов и подачи документов	ул. Чонгарская, д. 54 , г. Бобруйск, в здании Бобруйского управления Филиала «Центр «Белтехинвентаризация» в рабочие дни с 8.30 до 17.30

Общие сведения	**Лот № 1**	**Лот № 2**
Начальная цена продажи и размер задатка	**18 809 962 300** рублей, размер задатка – 10%, что составляет **1 880 996 200** рублей	**865 470 800** рублей, размер задатка – 10%, что составляет **86 547 100** рублей
Номер расчетного счета для перечисления задатка	**Получатель платежа** – Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минска, МФО 153001369, УНП 102353509	
Информация о земельном участке	Земельный участок с кадастровым номером 741000000006000115 расположен по адресу: г. Бобруйск, ул. Карла Маркса, 36, площадь условного участка – 333 кв.м	
Характеристика предмета торгов	Здание магазина 4-этажное кирпичное, год постр. – 1918, год реконструкции – 2005, фундамент – бутовый, перекрытия: чердачные – дерев., междуэтажные и подвальные – ж/бетон., кровля – металлочерепица, полы – плитка и бетон., отопление – от собств. котельной, имеются: водопровод, электроснабжение, центральная канализация, роллеты разных размеров. Состояние объекта – хорошее	Квартира находится в кирпичном многоквартирном доме с электроснабжением, централизованным отоплением, газоснабжением, холодным и горячим водоснабжением, канализацией, год постр. – 1983. Кол-во комн. – 3, этаж расположения 9–10, площадь кухни (столовой) – 37,1 кв.м, санузел совм., высота потолков – 2,47, в стадии ремонта. В квартире перепланировка не оформлена в установленном законодательством порядке. До перепланировки общая площадь квартиры составляла 99,6 кв.м, кол. комн. – 4
Условия продажи предмета торгов	Без условий	Проведение победителем аукционных торгов работ по восстановлению перепланировки и переустройства в части изоляции отапливаемого помещения квартиры от летнего помещения лоджии и переноса сетей отопления
Срок и условия оплаты за приобретенное с торгов имущество	В течение 80 календарных дней с момента подписания протокола о результатах аукционных торгов на счет Организатора торгов разовым платежом либо траншами	

Срок подачи документов, осмотра объектов и внесения задатка	**по 01 февраля 2016 г. включительно до 17.00**

Победитель (Претендент на покупку) возмещает затраты на организацию и проведение торгов не позднее 3 рабочих дней со дня проведения торгов в соответствии с соглашением о правах и обязанностях сторон

**Более подробная информация об условиях участия в торгах, перечне документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах, опубликована в газете «Рэспубліка» от 28 января 2015 г. и в газете «Звязда» от 10 сентября 2015 г.

Получить дополнительную информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 72 01 32, 72 13 93, 8 (044) 710-50-85 в рабочие дни с 8.30 до 17.30.

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

ДАПАМОЖАМ КЫРГЫЗСТАНУ

Напрыканцы мінулага года гэтую цэнтральнаазіяцкую краіну скаланула некалькі моцных землетрасенняў. Таму Савет Міністраў Беларусі прыняў рашэнне аказаць Кыргызстану гуманітарную дапамогу. Перадача каштоўнага грузу ўскладзена на МЗС і МНС.

— Туды адправяцца коўдры і палаткі, — паведамілі ў прэс-службе Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. — Кошт грузу ацэньваецца больш чым у 1 мільярд 800 мільёнаў рублёў. У бліжэйшыя некалькі дзён гуманітарную дапамогу даставяць чыгункай.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

СХЕМА ПРАЦУЕ,

або Куды вядзе патрэбны маршрут

Дзяржаўная ўстанова «Сталічны транспарт і сувязь» разам з РУП «Белгеадэзія» распрацавалі карту-схему прыгарадных маршрутаў.

На ёй адлюстраваны схемы прыгарадных аўтобусных маршрутаў, у тым ліку экспрэсных, заказчыкам па якіх выступае Мінскі гарвыканкам. Тут жа можна знайсці і схемы гарадскіх аўтобусных маршрутаў, трасы якіх выходзяць за межы горада. На карце-схеме адлюстравана і месцазнаходжанне сацыяльна-культурных аб'ектаў у Мінскім раёне, а таксама вузлавыя прыпыначныя пункты ў Мінску. Ахвотныя могуць скарыстацца распрацоўкай, звярнуўшыся да афіцыйнага сайту дзяржаўнай установы «Сталічны транспарт і сувязь». На форуме ў адпаведным раздзеле можна ўнесці і свае заўвагі і прапановы.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЮНАК ЗАТРЫМАЎ РАБАЎНІКА

Маладыя людзі, навучэнцы Баранавіцкага ПТВ-61, прагульваліся па вуліцы з дзяўчатамі. Раптам яны пачулі жаночы гучны крык. Лямантавала жанчына, у якой злодзей выхапіў сумачку і кінуўся ўцякаць. Ад групы моладзі аддзяліўся Сяргей Купчунас і пабег услед за рабаўніком. Хлопцу давялося праследаваць злодзея амаль кіламетр, але ён усё ж дагнаў зламысніка і паваліў на зямлю. Тым часам пад'ехаў нарад міліцыі, які выклікалі таварышы Сяргея. Жанчыне была вернута сумка, а рабаўнік 1994 года нараджэння накіраваны ў ізалятар часовага ўтрымання.

Як расказала **старшы інспектар Баранавіцкага ГУУС Вольга САКУТА**, затрыманы аказаўся раней судзімым. Паводле слоў афіцэра міліцыі, маладыя людзі праявілі сапраўдную грамадзянскую свядомасць. Калі б так дзейнічалі ўсе, у нас было б намнога менш правапарушэнняў.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ПАЛІЦЭЙСКІЯ, ЯКІЯ НЕ СПЯЦЬ

Каля дзясятка «спячых паліцэйскіх» з'явіцца сёлета ў Партызанскім раёне сталіцы.

— Такое рашэнне прыняла раённая Дзяржаўтаінспекцыя для зніжэння колькасці дарожна-транспартных здарэнняў, — распавяла **старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе АДАІ Партызанскага РУУС г. Мінска Таццяна СПАДАБАЕВА.** — Штучныя няроўнасці з'явяцца на найбольш аварыйна-небяспечных участках вулічна-дарожнай сеткі, каля пешаходных пераходаў, якія не рэгулююцца, побач з дзіцячымі ўстановамі, на скрыжаваннях і дваровых тэрыторыях. Дарэчы, зараз сваю «службу» на тэрыторыі раёна ўжо нясуць больш за 90 штучных няроўнасцяў накшталт «спячых паліцэйскіх».

Сяргей РАСОЛЬКА.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў выказваюць глыбокае спачуванне начальніку Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Юркевіч Галіне Іванаўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.